# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 10 лютага 2000 года, чацвер, № 2 (1814)


СУСТРЭЧЫ

## БЕЛАРУСЬ У СЁННЯШНІМ СВЕЦЕ

*31 студзеня ў зале пасяджэнняў Вучонага савета Белдзяржуніверсітэта адбылася сустрэча навуковай грамадскасці БДУ з першым намеснікам міністра замежных спраў Беларусі Сяргеем Мікалаевічам Мартынавым.*

На гэтую сустрэчу таксама былі запрошаны прадстаўнікі беларускіх і замежных сродкаў масавай інфармацыі, дыпламатычных устаноў, акрэдытаваных у Рэспубліцы Беларусь. Падчас сустрэчы С.М. Мартынаў расказаў аб галоўных напрамках і прыярытэтах знешняй палітыкі рэспублікі, даў дэталёвы каментарый інтэграцыйным працэсам, якія адбываюцца паміж Беларуссю і Расіяй, адзначыў важнасць развіцця адносін рэспублікі з іншымі суседнімі краінамі і неабходнасць актыўнага ўдзелу ў рэгіянальным супрацоўніцтве і пашырэнні сувязей з такімі арганізацыямі, як АБСЕ, Савет Еўропы, Еўрапейскі Саюз. Акрамя таго, С.М. Мартынаў адказаў на пытанні прысутных і заклікаў навуковую грамадскасць да актыўнага асэнсавання тых працэсаў, што адбываюцца ў галіне знешняй палітыкі Беларусі. Відавочна, што сучаснае месца нашай краіны ў свеце патрабуе сур'ёзнага навуковага аналізу. Неабходна асэнсаваць, дзе мы сёння знаходзімся, якую ролю можа адыграць Беларусь у сусветных эканамічных, гандлёвых, інтэграцыйных працэсах на кантыненце, у збудаванні новай архітэктуры еўрапейскай бяспекі, у міграцыйных, сацыяльных, гуманітарных працэсах. Як спроба знайсці адказы на гэтыя пытанні, па словах прарэктара БДУ па міжнародных сувязях Уладзіміра Аркадзьевіча Астапенкі, у бліжэйшы час у Белдзяржуніверсітэце плануецца стварэнне новага Цэнтра міжнародных даследаванняў. Гэта будзе першая навукова-даследчая ўстанова рэспублікі, перад якой будзе стаяць задача падрыхтаваць кіраўніцтву краіны, міністэрству замежных спраў тэарэтычныя і практычныя рэкамендацыі па распрацоўцы і ажыццяўленні знешнепалітычнай і знешнеэканамічнай палітыкі Беларусі. Сярод прыярытэтных навуковых тэм можна адзначыць такія, як стратэгія ўзаемаадносін Беларусі і Расіі, супрацоўніцтва з краінамі СНД, перспектывы і актывізацыя ўдзелу Беларусі ў рабоце еўрапейскіх рэгіянальных арганізацый, у прыватнасці Еўрапейскага Саюза, распрацоўка канцэпцыі знешнеэканамічнай і інвестыцыйнай палітыкі Беларусі. Перад спецыялістамі БДУ ставіцца задача садзейнічаць таму, каб напрацоўкі Цэнтра міжнародных даследаванняў дапамаглі дзяржаўным органам краіны больш дакладна вызначаць прыярытэты знешняй палітыкі, падрыхтавалі пэўную тэарэтычную базу для больш дэталёвага вызначэння сённяшняга месца Беларусі ў міжнародных адносінах, а таксама перспектывы яе развіцця.

*Таццяна КУХАРЧУК*

ВІНШУЕМ!

## Стыпендыі Урада Рэспублікі Беларусь

З 1 студзеня гэтага года стыпендыі Урада Рэспублікі Беларусь у памеры 10 мінімальных заробкаў будуць атрымліваць наступныя аспіранты нашага універсітэта: Вольга Мячкоўская (кафедра эканамічнай геаграфіі замежных краін), Ія Ташлыкова-Бушкевіч (кафедра фізікі цвёрдага цела), Дзмітрый Ушакоў (кафедра квантавай радыёфізікі і оптаэлектронікі), Уладзімір Фральцоў (кафедра міжнародных адносін).

## Адораныя студэнты — у БДУ

Сярод лаўрэатаў І Рэспубліканскага конкурсу творчых прац навучэнцаў і студэнтаў па грамадскіх навуках, прысвечанага яднанню славянскіх народаў, з уручэннем дыплома спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, ёсць і студэнты Белдзяржуніверсітэта. Сярод іх — Наталля Жаўнярковіч, студэнтка 4-га курса факультэта філасофіі і сацыяльных навук; Наталля Жураўлёва, пяцікурсніца філалагічнага факультэта; Алена Матусевіч, студэнтка 5-га курса факультэта філасофіі і сацыяльных навук; Алена Ільіна, другакурсніца юрыдычнага факультэта; Вікторыя Пушко, студэнтка 3-га курса юрыдычнага факультэта, Андрэй Акушка і Віктар Чараховіч, выпускнікі факультэта міжнародных адносін. Усе яны атрымаюць дыпломы і грашовыя прэміі ў памеры 10 мільёнаў рублёў.

*Вольга СЫРЫЧ*

АБ'ЯВЫ

### РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

**Загадчыкаў кафедраў:** інтэлектуальных сістэм, прыкладной лінгвістыкі, педагогікі і праблем развіцця адукацыі, геаграфічнай экалогіі;

**Прафесара кафедры** лазернай фізікі і спектраскапіі;

**Дацэнтаў кафедраў:** інфарматыкі, дыскрэтнай матэматыкі і алгарытмікі, глебазнаўства і геалогіі, англійскай мовы, беларусазнаўства, тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства;

**Старшых выкладчыкаў кафедраў:** дынамічнай геалогіі, нямецкай мовы, англійскай мовы;

**Выкладчыкаў кафедраў:** фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў і методыкі выкладання геаграфіі, гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу, міжнароднага права.

Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

**Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5 а, Белдзяржуніверсітэт, Упраўленне кадраў, т. 226-59-39.**

### НАЦЫЯНАЛЬНЫ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ ЦЭНТР МАНІТОРЫНГУ АЗОНАСФЕРЫ БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасады:**

**Навуковага супрацоўніка** па спецыяльнасці: праграмнае забеспячэнне аптычнага прыборабудавання — 1.

Тэрмін падачы заяў — адзін месяц з дня апублікавання аб'яў.

**Адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 7, пакой 905 а, тэл. 278-47-00. Упраўленне кадраў.**

### РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

**Вядучага навуковага супрацоўніка** Навукова-даследчай лабараторыі статыстычнага аналізу і мадэліравання — 1;

**Загадчыка** Навукова-даследчай лабараторыі геолага-экалагічных праблем — 1.

Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

**Адрас: 220050, г. Мінск, Белдзяржуніверсітэт, вул. Бабруйская, 9, Навукова-даследчая частка, упраўленне кадраў, пакоі 406, 407, тэл. 226-47-64.**

# ЛІЦЭЮ БДУ – 10 ГАДОЎ!

ЛЕТАПІС

## ГІСТОРЫЯ ЛІЦЭЯ Ў ДАТАХ І ЛІЧБАХ

**1989 год.** Пастанова Савета Міністраў БССР № 204 ад 18 ліпеня 1989 года "Аб арганізацыі пры БДУ імя У.І.Леніна Мінскай сярэдняй спецыялізаванай школы".

**1990 год.** 10 студзеня — першы дзень заняткаў у Мінскай сярэдняй спецыялізаванай школе пры БДУ, якая размяшчалася на базе СШ № 189 па вуліцы Гараўца ў Серабранцы.

**1991 год.** Мінскай сярэдняй спецыялізаванай школе пры БДУ далі асобны будынак па вуліцы Маякоўскага, 96.

**1993 год.** Загад міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь № 172 ад 8 чэрвеня "Аб рэарганізацыі Мінскай сярэдняй спецыялізаванай школы пры БДУ у Ліцэй пры БДУ".

**1994 год.** Загад міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь № 64 ад 5 сакавіка "Аб атэстацыі Ліцэя пры БДУ на пацвярджэнне статуса рэспубліканскага ліцэя".

**1995 год.** Пастанова калегіі Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь № 15 ад 28 лістапада "Аб размяшчэнні Ліцэя БДУ у будынку па вуліцы Ульянаўская, 8, які вызваляецца".

**1996 год.** Рашэннем Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь Ліцэй пры БДУ рэарганізаваны ў структурнае падраздзяленне Белдзяржуніверсітэта.

**1999 год.** Рашэннем Мінгарвыканкама ад 29 снежня № 1432 зарэгістравана навучальна-адукацыйная ўстанова "Ліцэй Беларускага дзяржаўнага універсітэта" (Пасведчанне № 0003913).

**2000 год.** 3-5 лютага — святкаванні, прысвечаныя 10-годдзю Ліцэя БДУ.

●●●

На сённяшні дзень у Ліцэі плённа працуюць 95 выкладчыкаў, з іх — 53 працуюць у БДУ і Ліцэі, кандыдатамі навук з'яўляюцца 24 выкладчыкі.

Колькасць навучэнцаў на канец студзеня 2000 года складае 479 чалавек. З іх дзяўчат — 204 (каля 42,6 %). Навучаецца на платнай аснове 61 чалавек (прыкладна 12,7 %). З іншых гарадоў і вёсак Беларусі ў Ліцэі навучаецца 91 чалавек (каля 19 %).

●●●

З 1991 па 1999 год па выніках удзелу ў рэспубліканскіх алімпіядах па беларускай мове, рускай мове, англійскай мове, матэматыцы, інфарматыцы, фізіцы, хіміі, біялогіі, астраноміі, гісторыі і геаграфіі ліцэісты БДУ атрымалі 270 дыпломаў і 66 пахвальных водзываў.

За ўдзел у міжнародных алімпіядах з 1992 па 1999 год па матэматыцы, фізіцы, інфарматыцы, біялогіі і хіміі Ліцэй БДУ можа ганарыцца 51 дыпломам і 5 пахвальнымі водзывамі (гл. 5-ю стар.).

●●●

Сярод выпускнікоў ліцэя ўжо ёсць кандыдаты навук. Гэта ліцэісты першага і другога выпуску: Леў Цімашэнка, Сяргей Ціханаў, Сяргей Плашчынскі абараняліся на механіка-матэматычным факультэце БДУ, Аляксей Харын абараняўся на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі нашага універсітэта, а Дзмітрый Чыгрын абараніўся ў Германіі. Усе яны кандыдаты фізіка-матэматычных навук. Магчыма, што гэты спіс далёка не поўны, бо выхаванцы ліцэя раз'ехаліся ў розныя канцы свету і паведамляць пра свае навуковыя поспехі іх ніхто не абавязваў. Дакладней кажучы, гэта пяць вядомых кандыдатаў. Спадары кандыдаты навук, былыя ліцэісты, калі вы не знайшлі свайго імя ў гэтым спісе, паведаміце пра сябе ў Ліцэй БДУ. Вам будуць удзячныя.

●●●

Пяцёра ліцэістаў, адвучыўшыся ў вышэйшых навучальных установах, вярнуліся ў ліцэй. Але ўжо ў якасці выкладчыкаў. Гэта Наталля Вайніловіч, Таццяна Маслава, Святлана Куневіч, Марыя Пятрашка і Вячаслаў Козараў.

●●●

За дзевяць год ліцэй выпусціў 1800 хлопцаў і дзяўчат. У 2000 годзе, апошнім годзе XX стагоддзя, з дзвярэй ліцэя выйдзе 2000-ы выпускнік. Калі ніхто не пакіне ліцэй раней лета, то, як падлічылі па алфавітнай кнізе, 2000-м выпускніком стане Дзмітрый Шапашнікаў з Мар'інай Горкі, які вучыцца ў 11 класе хімікаў-біёлагаў. У ліцэі лічаць, што вельмі сімвалічна тое, што 2001-м выпускніком стане ліцэіст з 11 класа матэматыкі і інфарматыкі Кастусь Шапашнікаў, брат-блізнец Дзмітрыя. На адной з вечарын ім будуць уручаны памятныя прызы.

●●●

За перыяд з 1991 па 1999 год у Ліцэі БДУ праходзілі навучанне 268 чалавек, што не пражывалі непасрэдна ў горадзе Мінску. Гэта 15 працэнтаў ад агульнай колькасці выпускнікоў. З іх 160 чалавек — з Мінскай вобласці, 15 — з Брэсцкай, 30 — з Гродзенскай, 16 — з Магілёўскай, 13 — з Гомельскай, 32 — з Віцебскай. Яшчэ два чалавекі прыязджалі за атрыманнем ліцэйскіх ведаў нават з Літвы.

**Ліцэісты, якія паступілі ў БДУ на прафілюючыя факультэты (па гадах)**

| | 1991 | 1992 | 1993 | 1994 | 1995 | 1996 | 1997 | 1998 | 1999 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Фізічны | 16 | 23 | 23 | 33 | 17 | 21 | 4 | 17 | 16 | 170 |
| Мех.-мат. | 20 | 26 | 29 | 19 | 20 | 8 | 24 | 19 | 9 | 174 |
| ФРФЭ | 13 | 24 | 27 | 35 | 25 | 29 | 34 | 22 | 18 | 227 |
| ФПМ | 32 | 30 | 26 | 34 | 33 | 44 | 47 | 46 | 47 | 339 |
| Філалагічны | 27 | 28 | 33 | 17 | 10 | 12 | 23 | 12 | 26 | 188 |
| Хімічны | -- | -- | -- | 9 | 17 | 12 | 9 | 12 | 19 | 78 |
| Гістарычны | -- | -- | -- | 10 | 8 | 19 | 8 | 15 | 14 | 74 |
| Журналістыкі | -- | -- | -- | -- | 7 | 7 | 6 | 6 | 3 | 29 |

МІЖНАРОДНЫЯ СУВЯЗІ

## ЗАМЕЖНЫЯ ГОСЦІ

На святы ліцэя прыехалі даўнія сябры з далёкага замежжа. Ужо трэці год у Беларусь па праграме "Civic education" прыязджаюць школьнікі з Фларыды на чале з Джорджам Ролерам. Гэта праграма накіравана на далучэнне школьнікаў да першага сацыялагічнага даследавання. "Беларускі універсітэт" паведамляў пра іх мінулагодні візіт і падрабязна расказваў пра гэту праграму. Нагадаем толькі, што ў пазамінулым годзе тэмай даследавання быў Чарнобыль. Але ўдзялялася ўвага не столькі самой катастрофе, колькі яе ўздзеянню на псіхалогію людзей. У мінулым годзе госці цікавіліся нетрадыцыйнымі метадамі лячэння, цяпер амерыканцы тэсціруюць студэнтаў і школьнікаў, якія курацъ.

Ёсць і яшчэ адны госці з Амерыкі, але ўжо са штата Пенсільванія. Прывёз гэтую групу настаўнік гісторыі і археалогіі Уолт Трэмер. Тут абмену школьнікамі пакуль няма, ідзе толькі наладжванне сувязей. Але ўсе трое маладых гасцей выступяць на навуковай канферэнцыі, прысвечанай 10-годдзю ліцэя на кафедры англійскай мовы.

І апошняя, самая шматлікая група з 30 чалавек завітала са Швецыі. Керстын Сундберг, кіраўнік, пазнаёмілася з ліцэістамі яшчэ ў 1992 годзе, а з 1993 пачаўся абмен школьнікамі. Мэта — пазнаёміцца з гісторыяй Беларусі і бытам беларусаў.

*Вольга КУЛІКОВА*

## ДЗЕНЬ ПЕРШЫ





# Першы крок у навуку

Трэцяга лютага на базе Дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М. Танка прайшла навукова-практычная канферэнцыя школьнікаў “Першы крок у навуку”. Падобныя канферэнцыі ладзяцца ў Ліцэі ўжо не першы год. Але гэтая была не зусім звычайная — юбілейная, прысвечаная 10-годдзю Ліцэя БДУ.

У дзесяці секцыях па дзесяці прадметах удзельнічалі 140 юнакоў і дзяўчат. Прынялі ўдзел у канферэнцыі і госці Ліцэя. Другі год запар на ёй выступілі вучні з Браслаўскай гімназіі. Што датычыцца гасцей з далёкага замежжа, то яны, натуральна, амаль усе знаходзіліся на секцыі англійскай мовы.

*Вольга КУЛІКОВА*

*На фотаздымках: падчас правядзення канферэнцыі*
*Фотаздымкі Аляксандра ЗАПОЛЬСКАГА*



## ДЗЕНЬ ДРУГІ

# СПАРТЫЎНАЕ СВЯТА

Спяшаючыся на ліцэйскія гульні, мы з фатографам прыбылі ў Спорткомплекс БДУ разам са Святланай Віктараўнай Багранцавай, настаўніцай рускай мовы і літаратуры. Яе характэрную ўсмешку і слова “сюр” (ад фр. — супер), якое яна любіла паўтараць у маю бытнасць ліцэістам, запомніліся назаўсёды. Не дарма журналісты “Знамени юности” змясцілі менавіта яе фота на першай паласе нумара з матэрыялам пра юбілей. “Спазнілася на тралейбус”, — пракаменціравала яна мімаходзь і паспяшалася на другі паверх, у спартыўную залу. Мінуўшы спецыяльна арганізаваны да свята буфет у фае другога паверха, мы пайшлі за ёй, каб нічога цікавага не прапусціць. І не прапусцілі: усё пабачылі на свае вочы, ад урачыстага вынасу і падняцця ліцэйскага сцяга да фінальнага баскетбольнага матча.



Спаборнічалі тры каманды: каманда 10-х класаў, каманда 11-х класаў і інтэрнацыянальная дружына выкладчыкаў, у склад якой увайшлі таксама госці з ЗША і Швецыі. Спецыяльна для іх прамежкавыя вынікі аб’яўляліся і на англійскай мове. Журы, якое складалася таксама з выкладчыкаў, але больш шчаслівейшых, загадкава ўсміхалася. Як выявілася, рыхтавала сюрпрызы. Пасля першай эстафеты наперадзе ішлі 10-я класы, потым — 11-я, і затым — выкладчыкі. А ўжо пасля другой — каманды параўналіся, маючы па восем ачкоў. Вакол стаяў неверагодны гвалт. Дзяўчаты пішчалі, віснучы на поручнях. Вядучы прафесіянальна рабіў сваю справу. І тады, калі ўрачыста называў імёны знакамітых у спартыўным свеце ліцэістаў, і тады, калі нефармальна балбатаў з амерыканскім прафесарам, і тады, калі не вытрымаўшы накалу пачуццяў, кінуўся дапамагаць дзяўчатам цягнуць канат (перацягванне канатаў адбылося адразу пасля заканчэння эстафет).

Потым былі наладжаны конкурсы, дзе кожны мог перамагчы індывідуальна: удары на дакладнасць па варотах, падняцце гіры, армрэслінг, складаная гульня з вядром і шарыкамі пад назвай “Паспрабуй патрапіць” і конкурс трохачковых кідкоў па кальцу. І што ж? Некаторыя неспрактыкаваныя ліцэісткі забівалі па два-тры трохачковыя. Высокі госць з Амерыкі, нягледзячы на свой сапраўды высокі рост, з дванаццаці мячоў ні разу не патрапіў у карзіну. Эх, Маямі, эх, Фларыда... Ну ды затое Джордж Ролер паказаў спрыт, з гора шпурляючы шарыкі ў вядро, — і увайшоў-такі ў прызавую тройку. Тут і я таксама вырашыў не стаяць у баку і запісаўся на арм-

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*

ДЗЕНЬ ДРУГІ

# СПАРТЫЎНАЕ СВЯТА

*(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)*

рэслінг. Першым маім сапернікам аказаўся ... Генадзь Уладзіміравіч Пальчык! Шанцаў у мяне не было. Толькі тое, што Генадзь Уладзіміравіч велікадушна паддаўся, дазволіла мне пратрымацца тры секунды. Прайграўшы дзве схваткі запар, я выбыў з далейшых спаборніцтваў. І ўсё ж такі нейкім незразумелым чынам заняў другое месца сярод непрафесіяналаў, атрымаўшы, як і іншыя пераможцы, дыплом і ручку з ліцэйскай эмблемай — чатырохпольным картушам з каранаванай літарай "Л" у цэнтры.

А потым пасля працэдуры ўзнагароджвання пачаўся баскетбол. Я пайшоў азнаёміцца з вынікамі конкурсаў, а наш фатограф у гэты час цікаваў ля выхаду: па праграме напрыканцы прадугледжвалася перанесці свята ў басейн, і можна было б зрабіць цудоўныя здымкі ліцэйскіх выкладчыкаў у купальных касцюмах. На жаль, басейн быў фактычна адменены, бо свята і так зацягнулася. Але, як запэўніў нас Мікалай Васільевіч Ярута, калі выкладчыкі не пайшлі ў басейн сёння, то яны абавязкова пойдуць туды пазней, бо ўвесь выкладчыцкі састаў вядзе выключна здаровы лад жыцця.

Не важна, што 10-я класы занялі першае месца ў камандных эстафетах, а выкладчыкі — трэцяе. Важна, што ўсе сталі яшчэ большымі сябрамі. Сябрамі па спорце. А за спартыўнае свята ліцэістам і гасцям трэба яшчэ раз падзякаваць дырэктара Ліцэя Г.У. Пальчыка, загадчыка кафедры фізічнай культуры Ю.У. Бабра, настаўнікаў фізкультуры А.І. Мецеля, Ц.Я. Андрэева, Я.Я. Казлоўскага, У.М. Янчэню, М.В. Яруту і харэографа В.І. Гусінец.

А вось абяцаны спіс пераможцаў індывідуальных конкурсаў з першага па трэцяе месцы:

"Пенальці": Дзмітрый Жылко (10м1), Пётр Дудзін (10х), Генадзь Люцько (11м2).

Трохачковыя кідкі: Іван Мяркушын (выпускнік), Ягор Паўлючук (11м1), Сяргей Астрэйка (10м1).



Штуршок гіры (10-я класы): Канстанцін Іванчык (10ф1), Андрэй Іванец (10х), Яўген Маціеўскі (10ф2).

Штуршок гіры (11-я класы): Дзмітрый Лейчык (11ф2), Валерый Казак (11м2), Генадзь Люцько (11м2).

"Паспрабуй патрапіць" (сярод мужчын): Міхаіл Скурчык (10гіст), Георг Ролер (ЗША), Мікалай Аліменкаў (11м2).

"Паспрабуй патрапіць" (сярод дзяўчат): Алена Халандырова (11ф2), Наталля Гінёва (11філ2), Анастасія Вайцяхоўская (10філ3).

Армрэслінг (сярод юнакоў): Андрэй Іванец (10х), Генадзь Люцько (11м2), Валерый Казак (11м2).

Армрэслінг (сярод дзяўчат): Галіна Сямейка (11хб), Алена Дэмбоўская (11філ2), Ірына Янчэня (11міф).

*Уладзімір СТАТКЕВІЧ*

*Фотаздымкі Аляксандра ЗАПОЛЬСКАГА*






ДЗЕНЬ ТРЭЦІ

# SUMMA CUM LAUDE – ВЫШЭЙШАЯ ПАХВАЛА

А назаўтра свята завяршалася грандыёзным чатырохгадзінным прадстаўленнем у канцэртнай зале "Мінск".

Свабодных месцаў не было. А на сцэне сапраўды быў "сюр"!

Ліцэісты спявалі, танцавалі, ігралі на гітарах, адпускалі жарты, "рэпрызілі". Кожны выпуск падрыхтаваў да канцэрта свой нумар. Спецыяльна на гэты вечар прыехала група "Беларускія песняры", якая прысвяціла Ліцэю сваю песню "Толькі з табой". Танчылі самбу дзяўчаты з ліцэйскага калектыва "Глорыя". Званне Ганаровага ліцэіста атрымалі "два Аляксандры, два рэктары, два сябры" — Аляксандр Уладзіслававіч Казулін, рэктар БДУ, і Аляксандр Іванавіч Жук, рэктар Акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Сарвалі апладысменты спробы амерыканскіх і шведскіх гасцей распачаць гаворку на рускай мове. Хвілінай пазней выявілася, што ліцэісты ўсё ж лепш валодаюць англійскай мовай, чым амерыканцы — рускай. Прамову зразумелі без перакладу. Жартавалі традыцыйна пра ўказку і моцныя пальцы Дз.К. Краўцэвіча, пра ліцэйскія беляшы і прозвішча дырэктара. А таксама пра сімволіку лічбы 10. "Ну, цяпер ужо ніхто не скажа, што Ліцэй — гэта нуль без палачкі. З палачкай — ды яшчэ з якой!"

Але як ні стараліся выпускнікі, як ні выхваляўся сваёй адметнасцю выпуск 1999 года, ліцэйскія выкладчыкі падрыхтавалі нешта фантастычнае. Гэта была феерычная музычная пастаноўка па матывах розных казак, сярод якіх моцна вылучалася сюжэтная лінія "Царамка". Выканаўцамі не было сказана ні слова — казку агучваў пранікнёны голас прафесіянальнага радыёдыктара, у якім угадваліся інтанацыі загадчыка кафедры фізікі У.А. Багамолава. Урэшце прыйшоў мядзведзь, зялёны церамок разваліўся на кавалачкі... І на сцэне з'явіўся новы стылізаваны ліцэйскі будынак, у які ліцэісты нарэшце ўвойдуць у наступным годзе.

Свята завяршалася. Як заўважылі вядучыя, нарэшце-такі збылася мара Карлсана. На сцэну вынеслі не адзін торт з дзесяццю свечкамі, а дзесяць тартоў з адной свечкай на кожным. З глядзельнай залы падняліся на свет рампы старасты ўсіх дзесяці выпускаў і пад гром апладысментаў, які працягваўся мінут пяць, свечкі былі задзьмуты. Хто паспеў — загадаў жаданне. А вось хто з'еў тыя тарты, для мяне так і засталося таямніцай.

*Уладзімір МІХАЙЛАЎ*

# ПЕРАМОЖЦЫ МІЖНАРОДНЫХ АЛІМПІЯД (1992-1999 ГАДЫ)

| Год правядзення | Спецыяльнасць | Імя, прозвішча | Клас | Узнагарода | Месца правядзення алімпіяды |
|---|---|---|---|---|---|
| 1992 | Матэматыка | Сяргей Кузьміч | 11м1 | бронзавы медаль | Расія, Масква |
| 1992 | Матэматыка | Кірыл Хвенкін | 11м1 | бронзавы медаль | Расія, Масква |
| 1992 | Інфарматыка | Уладзімір Белы | 10ф | сярэбраны медаль | Германія, Бон |
| 1993 | Матэматыка | Таццяна Акатава | 11м1 | бронзавы медаль | Турцыя, Стамбул |
| 1993 | Інфарматыка | Уладзімір Белы | 11ф | залаты медаль | Аргенціна |
| 1994 | Матэматыка | Уладзімір Ляшкевіч | 11м | бронзавы медаль | Ганконг |
| 1994 | Матэматыка | Сяргей Шарапаў | 11пм1 | бронзавы медаль | Ганконг |
| 1994 | Матэматыка | Мікалай Калоша | 11фм2 | пахвальны водзыў | Ганконг |
| 1994 | Інфарматыка | Аляксей Баулін | 11пм2 | бронзавы медаль | Швецыя, Стакгольм |
| 1994 | Інфарматыка | Максім Кузьмін | 11лм1 | залаты медаль | Швецыя, Стакгольм |
| 1994 | Інфарматыка | Максім Пашкевіч | 10фм7 | бронзавы медаль | Швецыя, Стакгольм |
| 1994 | Біялогія | Аксана Грычык | 10ф1 | сярэбраны медаль | Балгарыя, Сафія |
| 1995 | Матэматыка | Сяргей Шых | 10м1 | сярэбраны медаль | Канада, Таронта |
| 1995 | Матэматыка | Андрэй Ядранцаў | 11м1 | бронзавы медаль | Канада, Таронта |
| 1995 | Матэматыка | Максім Алейнікаў | 10м1 | бронзавы медаль | Канада, Таронта |
| 1995 | Матэматыка | Міхаіл Вронскі | 10м1 | пахвальны водзыў | Канада, Таронта |
| 1995 | Фізіка | Ігар Варакса | 11ф | пахвальны водзыў | Аўстралія |
| 1995 | Інфарматыка | Павел Лангер | 10м1 | бронзавы медаль | Галандыя, Эйндховен |
| 1995 | Біялогія | Аксана Грычык | 11ф | бронзавы медаль | Тайланд, Бангкок |
| 1995 | Біялогія | Іна Урбановіч | 10 | бронзавы медаль | Тайланд, Бангкок |
| 1996 | Матэматыка | Сяргей Шых | 11м1 | залаты медаль | Індыя, Бамбей |
| 1996 | Матэматыка | Міхаіл Вронскі | 11м1 | сярэбраны медаль | Індыя, Бамбей |
| 1996 | Матэматыка | Максім Алейнікаў | 11м1 | бронзавы медаль | Індыя, Бамбей |
| 1996 | Матэматыка | Аляксей Каранёў | 10м2 | бронзавы медаль | Індыя, Бамбей |
| 1996 | Інфарматыка | Павел Лангер | 11м1 | сярэбраны медаль | Венгрыя |
| 1996 | Інфарматыка | Іван Міхневіч | 11м2 | сярэбраны медаль | Венгрыя |
| 1996 | Хімія | Андрэй Бекіш | 11х | бронзавы медаль | Расія, Масква |
| 1996 | Хімія | Канстанцін Прахарэвіч | 11х | бронзавы медаль | Расія, Масква |
| 1996 | Біялогія | Іна Урбановіч | 11х | бронзавы медаль | Украіна, Ялта |
| 1996 | Біялогія | Іван Гарнастай | 10х | сярэбраны медаль | Украіна, Ялта |
| 1997 | Матэматыка | Аляксей Каранёў | 11м2 | сярэбраны медаль | Аргенціна, Мар-дэль-Плата |
| 1997 | Матэматыка | Аляксей Пагірніцкі | 11м2 | сярэбраны медаль | Аргенціна, Мар-дэль-Плата |
| 1997 | Матэматыка | Іван Фамін | 11м2 | бронзавы медаль | Аргенціна, Мар-дэль-Плата |
| 1997 | Фізіка | Мікалай Сабель | 11ф | бронзавы медаль | Канада, Садберы |
| 1997 | Фізіка | Васіль Вяжэвіч | 11рф | пахвальны водзыў | Канада, Садберы |
| 1997 | Біялогія | Іван Гарнастай | 11х | залаты медаль | Туркменістан |
| 1997 | Біялогія | Юрый Любецкі | 10э | бронзавы медаль | Туркменістан |
| 1998 | Матэматыка | Іван Лосеў | 10м1 | сярэбраны медаль | Тайвань, Тайбэй |
| 1998 | Матэматыка | Дзмітрый Бадзягін | 10м3 | бронзавы медаль | Тайвань, Тайбэй |
| 1998 | Фізіка | Іван Сіўцоў | 11ф | бронзавы медаль | Ісландыя, Рэйк'явік |
| 1998 | Хімія | Святлана Мартыненка | 11х | сярэбраны медаль | Аўстралія, Мельбурн |
| 1998 | Хімія | Антон Шаўлікаў | 11х | пахвальны водзыў | Аўстралія, Мельбурн |
| 1998 | Хімія | Яўген Пляшэвіч | 10х | сярэбраны медаль | Аўстралія, Мельбурн |
| 1998 | Біялогія | Аляксей Бязручка | 11э | сярэбраны медаль | Германія, Кіль |
| 1998 | Біялогія | Юрый Любецкі | 11э | сярэбраны медаль | Германія, Кіль |
| 1999 | Фізіка | Андрэй Малашэвіч | 11ф | залаты медаль | Італія, Падуя |
| 1999 | Фізіка | Леанід Клімовіч | 11ф | сярэбраны медаль | Італія, Падуя |
| 1999 | Фізіка | Дзмітрый Шырокі | 11ф | сярэбраны медаль | Італія, Падуя |
| 1999 | Матэматыка | Іван Лосеў | 11м1 | залаты медаль | Румынія, Бухарэст |
| 1999 | Матэматыка | Дзмітрый Бадзягін | 11м3 | сярэбраны медаль | Румынія, Бухарэст |
| 1999 | Матэматыка | Трафім Ласы | 11м2 | сярэбраны медаль | Румынія, Бухарэст |
| 1999 | Матэматыка | Аляксандр Усніч | 10м1 | сярэбраны медаль | Румынія, Бухарэст |
| 1999 | Хімія | Яўген Пляшэвіч | 11х | сярэбраны медаль | Тайланд, Бангкок |
| 1999 | Хімія | Юрый Галаўко | 11х | сярэбраны медаль | Тайланд, Бангкок |
| 1999 | Хімія | Павел Паляшчук | 11х | бронзавы медаль | Тайланд, Бангкок |
| 1999 | Біялогія | Канстанцін Катлінскі | 11эк | бронзавы медаль | Швецыя, Унсала |

# ПАЕЗДКА Ў ШВЕЙЦАРЫЮ - РЭАЛЬНАСЦЬ

*Цэнтр еўрапейскай дакументацыі і інфармацыі Белдзяржуніверсітэта інфармуе аб магчымасці ўдзелу ў чацвёртай Праграме навуковага супрацоўніцтва паміж краінамі Усходняй Еўропы і Швейцарыяй на 2000—2003 гады (Scientific co-operation between Eastern Europe and Switzerland, SCOPES - 2000-2003). Штогадовае фінансаванне праграмы складае 3,5 мільёна швейцарскіх франкаў (1 еўра складае прыкладна 1,6 швейцарскіх франкаў).*

*Праграма SCOPES ахопліваае розныя навуковыя дысцыпліны і прадугледжвае некалькі тыпаў грантаў:*

**1. ГРАНТЫ НА ЎДЗЕЛ У МІЖНАРОДНЫХ ЕЎРАПЕЙСКІХ КАНФЕРЭНЦЫЯХ, ЯКІЯ ПРАВОДЗЯЦЦА Ў ШВЕЙЦАРЫІ.**

Фінансаванне на адну канферэнцыю складае 10000 швейцарскіх франкаў, у тым ліку 2000 швейцарскіх франкаў на аднаго ўдзельніка. Просьба аб падтрымцы ўдзелу ў канферэнцыі падаецца ў аргкамітэт канферэнцыі, які далей накіроўвае заяўкі ў SCOPES. Апошні тэрмін падачы заявак — два месяцы да пачатку канферэнцыі — да 01.09.2003 года.

**2. ГРАНТЫ НА ПАДРЫХТОЎКУ ПРАЕКТАЎ.**

Гэты грант даецца для садзейнічання ў распрацоўцы заявак на сумесны даследчы праект альбо на ўдзел у акцыі "Інстытуцыйнае партнёрства". Апошні тэрмін падачы заявак, якія прадстаўляюцца каардынатарам праекта са швейцарскага боку, — 1 сакавіка 2000 года (на падрыхтоўку даследчага праекта) і 15 красавіка 2000 года (на падрыхтоўку праекта ў рамках інстытуцыйнага партнёрства). Памер гранта — 3000 швейцарскіх франкаў на два ўдзельнікі (аплата праезду і камандзіровачных выдаткаў).

**3. СУМЕСНЫ ДАСЛЕДЧЫ ПРАЕКТ.**

У сумесным праекце павінны ўдзельнічаць як мінімум па адной даследчыцкай групе са Швейцарыі і краіны-партнёра. Працягласць праекта — ад 18 да 36 месяцаў. Максімальны аб'ём фінансавання на 36 месяцаў — 60000 швейцарскіх франкаў. Пры гэтым удзельнікі з краін-партнёраў атрымліваюць не менш за 80 % выдаткаванай на праект сумы. Апошні тэрмін падачы заявак — 15 сакавіка 2000 года.

**4. ІНСТЫТУЦЫЙНАЕ ПАРТНЁРСТВА.**

Фінансаванне па дадзеным раздзеле прадугледжвае развіццё і мадэрнізацыю ВНУ і акадэмічных інстытутаў. Пры гэтым фінансавая падтрымка даецца арганізацыйным і кіраўніцкім структурам ВНУ. На жаль, удзел у такіх праектах прадугледжаны толькі для пяці краін — Балгарыі, Босніі і Герцагавіны, Расіі, Румыніі і Украіны.

Пакет дакументаў, неабходных для запаўнення заявак на гранты, можна атрымаць на WEB-старонцы Швейцарскага нацыянальнага навуковага фонду па адрасе: http://www.snf.ch (раздзел International/Eastern European Countries), а таксама па пошце, факсу альбо па электроннай пошце:

Swiss National Science Foundation
SCOPES
P.O.Box 8232
CH-3001 Berne
Switzerland
Fax:+41-31-301-30-09
e-mail:scopes@snf.ch

З усімі матэрыяламі, а таксама са спісам навуковых дысцыплін, якія ахопліваюць гэтую праграму, можна пазнаёміцца ў Цэнтры еўрапейскай дакументацыі і інфармацыі Белдзяржуніверсітэта, які размешчаны па адрасе: праспект Ф. Скарыны, 4, пакой 112, тэл./факс (375)(17)220-65-38, e-mail:yri@org.bsu.unibel.by

*Цэнтр еўрапейскай дакументацыі і інфармацыі Белдзяржуніверсітэта*

НАША ЗДАРОЎЕ

# Да стаматолага – з радасцю

Дрэннае харчаванне і галоўным чынам "зуброжка" неспрыяльна ўплываюць на студэнцкія зубы. Да таго ж студэнты толькі пачынаюць выбірацца з таго самага крытычнага ўзросту, калі, як лічаць стаматолагі, карыес развіваецца найбольш моцна. Калі цяпер знайсці трошкі часу сярод сваіх шматлікіх інтарэсаў, хобі і забаў, каб комплексна вылечыць увесь свой малады яшчэ і моцны рад зубоў, то высокая верагоднасць захаваць прыгожую ўсмешку яшчэ надоўга. Стаматолагі пераканаўча настойваюць, што 90 працэнтаў здароўя зубоў залежыць ад догляду поласці рота, і дабаўляюць пры гэтым, што звычайнай штодзённай працэдуры з зубной шчоткай не дастаткова. Вельмі важнай часткай гігіены з'яўляецца прафесійная стаматалагічная апрацоўка поласці рота, паверхні зубоў і асабліва зубных прамежкаў, якая заключаецца ў знішчэнні налёту і зубнога каменя з дапамогай спецыяльных інструментаў і паст. Гэтую апрацоўку трэба праводзіць адзін раз у паўгода, тады верагоднасць захворванняў зубоў будзе зведзена да мінімуму.

Улічваючы гэтыя асаблівасці, стаматалагічны кабінет фірмы Jonathan прапануе праграму, распрацаваную спецыяльна для студэнтаў і накіраваную на комплекснае лячэнне зубоў у маладым узросце. Спецыялісты Jonathan лічаць, што ад праблем з зубамі трэба пазбаўляцца як мага раней, пакуль іх яшчэ можна паправіць.

Потым цяжэй лячыць запушчаныя хваробы, пламбіраваць каналы і рабіць дарагое пратэзіраванне.

Улічваючы крытычную сітуацыю менавіта з гэтай часткай пацыентаў, Jonathan галоўным чынам заглядвае менавіта ў студэнцкія раты, і, супрацоўнічаючы з Беларускім дзяржаўным універсітэтам, распрацоўвае спецыяльную сістэму, якая прадугледжвае скідкі для ўсіх студэнтаў БДУ і праграму комплекснага лячэння зубоў "Oral — health" (Здаровы рот).

Гэтая праграма распрацавана з улікам вопыту заходняй стаматалогіі.

Малады чалавек, які вырашыў вылечыць свае зубы, атрымоўвае спецыяльную картку, якая ўтрымлівае неабходныя даныя аб ім. Збіраецца кансіліум, на якім урачы аналізуюць ход лячэння і потым паступова вырашаюць усе без выключэння праблемы пацыента. У выніку, акрамя ідэальна саніраванага рота, удзельнік праграмы становіцца членам своеасаблівага клуба "Oral — health" і трапляе пад пастаяннае назіранне ўрачоў Jonathan, якія сочаць за здароўем зубоў і рэгулярна праводзяць карэкцыю гігіены поласці рота. Калі ўзнікае новая праблема, яна лёгка вырашаецца, бо выяўляецца ў самым пачатку. На ўсе вылечаныя зубы існуе пяцігадовая гарантыя. Калі, дзякуючы правільнаму догляду, усе зубы застаюцца ў поўным парадку, пацыент атрымлівае што-небудзь у падарунак ад сваіх урачоў. У будучым плануецца праводзіць забаўляльныя вечарыны для ўдзельнікаў праграмы "Oral — health", а таксама прапанаваць сваю дапамогу студэнтам іншых ВНУ.

Зразумела, што такое задавальненне каштуе грошай, але, калі вы ўсё ж такі вырашылі звярнуцца ў платную клініку, значыць, у вас з'явілася магчымасць выбраць менавіта тое, што больш за ўсё падыходзіць, і атрымаць прафесійную стаматалагічную дапамогу, якая адпавядае сусветным стандартам.

*Аліса БІЗЯЕВА*

# Нават калі ты не закаханы, стань ім хоць бы на адзін дзень

Дзень святога Валянціна. Гэтае свята шырока вядома ў Еўропе і Амерыцы. Яно не мае пад сабой глыбокай рэлігійнай асновы, нягледзячы на тое, што каталіцкая царква ўшаноўвае памяць чатырнаццаці Валянцінаў і трох Валянцін. Вытокі ж яго можна знайсці ў шматлікіх легендах.

Па адной з іх, у гэты дзень у дахрысціянскія часы было свята ў гонар бога зямлі і ўрадлівасці Дзіяніса. Пасля рытуальных плясак і гульняў яго ўдзельнікі — спрытныя і прыгожыя юнакі — вымалі з кошыка запіскі з імем дзяўчыны. Па павер'і, гэтая дзяўчына магла стаць жонкай у гэтым годзе. А ў Старажытным Рыме на 15 лютага прыпадала свята Луперкаліі. Абрады іх павінны былі абараніць гараджан ад ваўкоў. Напярэдадні Луперкалій ладзілася свята ўрадлівасці, падчас якога заахвочваліся легкадумства ў адносінах з супрацьлеглым полам.

Магчыма, свята звязана з разуменнем слова “VALENTINE” як скажонага старафранцузкага “галантны”. А элемент гульні і нечаканасці падчас “дня галантных учынкаў” надаваў атмасферы свята шарм і пікантнасць, спрыяў лірычнаму выказванню сваіх пачуццяў, а таксама быў выдатнай падставай для падарункаў. Потым, у VII—VIII стагоддзях гэта свята атрымала апякунства святога Валянціна і ператварылася ў свята закаханых.

У Сярэднявеччы таксама лічылася, што 14 лютага птушкі выбіраюць сабе пару на наступны год. Пасля гэтая думка стала вытокам дня святога Валянціна, апекуном закаханых.

Аднак найбольш часта традыцыі дня закаханых звязваюць з легендай пра хрысціянскага святога Валянціна. Пра яго вядома няшмат. Лічыцца, што ён нарадзіўся ў горадзе Церні Рымскай імперыі дзесьці напачатку III стагоддзя н. э. Епіскап Церні вельмі прыхільна ставіўся да закаханых. Ён дарыў ім кветкі, мірыў пасварыўшыхся і нават насуперак загаду імператара Юлія Клаўдзія II, які быў выдадзены ў 200 годзе н. э., тайна вянчаў легіянераў. За гэтыя “антыдзяржаўныя дзеянні” ён быў кінуты ў турму, дзе пакахаў сляпую дачку свайго турэмшчыка (па іншай версіі — ката). За абяцанне нікога больш не вянчаць імператар прапанаваў Валянціну жыццё, але епіскап адмовіўся. Яго пакаралі 14 лютага 270 года н. э., аднак перад смерцю ён паспеў напісаць ліст сваёй каханай, які падпісаў “твой Валянцін”. Выконваючы апошнюю волю асуджанага, кат перадаў запіску дзяўчыне, якая, дзякуючы лісту, пачала бачыць. Прах епіскапа Церні быў пахаваны ў царкве Святога Праксідзіяна ў Рыме, а вароты храма пачалі называць “Варотамі Валянціна”.

Аднак рэлігійныя даследчыкі лічаць, што Валянцінаў было двое, бо калі глядзець па датах, што захавала гісторыя, то можна знайсці шмат супярэчнасцей. Гэты і іншыя факты даюць падставы лічыць, што ў Рыме пахаваны не епіскап Церні, а рымскі пакутнік Валянцін, які жыў прыкладна ў гэты ж час і таксама за сваё стаўленне да закаханых быў пакараны смерцю.

Але як бы там ні было, у 496 годзе папа Гелазій I кананізаваў Валянціна, а яго перадсмяротная запіска ператварылася ў “валянцінку” — сімвал вечнай прыхільнасці і вернасці.

Першая “валянцінка”, датаваная пачаткам XV стагоддзя, уяўляла сабой узор разьбы па дрэве. Яна мела выяву рыцара, якому дама дорыць букет кветак. Пасля “валянцінка” трансфармавалася ў паштоўку. Яе сталі ўпрыгожваць ажурнай вышыўкай, стужкамі, залатой мішурой, распісвалі ў пастэльных танах і малявалі знутры сэрца ружовага колеру з залатым абадком. Цяпер такія “валянцінкі” можна пабачыць толькі ў музеях; звычайна яны належалі вядомым гістарычным асобам.

Серыйны выпуск “валянцінак” пачалі амерыканцы і зарабілі на гэтым вялікія грошы. Так, Эстэр Хоўланд, аўтар адной з першых тыражных валянцінак, зарабіў у 1840 годзе 5000 долараў — значныя па тых часах грошы.

Класічнай эмблемай дня святога Валянціна лічыцца чырвоная ружа. Згодна з антычнай легендай, яна з'явілася дзякуючы Афрадыце, багіні кахання і прыгажосці. Спяшаючыся да Адоніса, свайго параненага каханага, яна наступіла на куст белых руж, пракалола шыпамі нагу, і яе боская кроў зрабіла ружы пунсовымі. А ўпершыню чырвоныя ружы 14 лютага былі падораны Марыі-Антуанеце Людовікам XVI.

Разам з “валянцінкамі”, на якіх традыцыйна пішуцца вершы, пажаданні, прызнанні ў каханні, прынята дарыць невялікія падарункі. Гэта могуць быць кветкі ці якія-небудзь прыемныя дробязі. Выдатным падарункам лічацца шакаладкі, якія пачалі дарыць дамам англічане ў XVI стагоддзі. Менавіта ў гэты час яны разам з іспанцамі прывезлі ў Еўропу першыя партыі какава-бабоў.

Што датычыцца традыцыі адзначаць дзень святога Валянціна, то першы ўспамін пра гэта сустракаецца ў “Кентэрберыйскіх апавяданнях” Джэфры Фостэра. У Англіі ён афіцыйна адзначаецца з 1532 года, калі кароль Генры VIII выдаў спецыяльны дэкрэт, які надаў дню святога Валянціна статус дзяржаўнага свята. ЗША святкуе дзень святога Валянціна з 1777 года.

Але як з цягам часу, так і ў залежнасці ад краіны традыцыі святкавання дня закаханых вельмі вар'іравалі. У Сярэднявеччы да гэтага свята было прынята складаць сэрэнады, што ўслаўлялі годнасць каханай. З часам творы сталі больш іранічнымі, сентыментальнымі, а потым і злымі. А эпоха Адраджэння наогул знішчыла гэтую традыцыю.

Сёння 14 лютага лічыцца адным з самых лірычных свят ва ўсім свеце. На шчокі наклейваюць сэрцы і зорачкі, без усялякага сораму тэлефануюць любімым выкладчыкам і настаўнікам, ходзяць у абдымку, абменьваюцца пацалункамі і, наогул, вядуць сябе гарэзліва.

Акрамя гэтага, у ЗША штогод перасылаецца каля 1 мільярда паштовак з віншаваннямі. Прыбытак пошты складае больш за 1 мільярд долараў. Прадаўцы кветак рэалізуюць 60-70 мільёнаў пунсовых руж, ці 22-24 тысячы кветак у хвіліну. Колькасць электронных пасланняў у Інтэрнэт 14 лютага ідзе на мільёны.

У Англіі значная колькасць “валянцінак” ананімная: не мае зваротнага адраса, напісана справа налева ці левай рукой. Так прынята, каб надаць загадкавасць. Таму пасля 14 лютага прыватных дэтэктываў літаральна засыпаюць заказамі на выяўленне асобы адпраўшчыка.

Рым падчас Сан-Валянціна прапануе забавы на любы густ. Танцы пад музыку для закаханых, піца, імша ў храме Святога Валянціна, сустрэчы са знакамітасцямі — усё гэта спецыяльна для закаханых. Уся атмасфера Вечнага горада быццам бы кажа: “Нават калі ты не закаханы, стань ім хоць бы на адзін дзень”.

Важным атрыбутам іспанскіх традыцый з'яўляюцца падарункі. Гэта могуць быць кветкі (па большай частцы гваздзікі), цукеркі, простыя ювелірныя ўпрыгожанні. Дарыць у асноўным мужчыны; прадстаўніцам прыгожага полу таксама не забараняецца дарыць што-небудзь, але гэта неабавязкова. Калі жанчына дорыць што-небудзь у адказ, то гэтым дэманструе прыязныя адносіны да паклонніка.

Японцы наогул падышлі да 14 лютага звышарыгінальна, ператварыўшы яго ў “8 сакавіка для мужчын”. Падарункі тут атрымлівае моцны пол.

Традыцыі святкавання дня закаханых Расійскай імперыі падчас СССР былі страчаныя, а на Беларусі гэтае свята пачалі адзначаць толькі ў 90-я гады, як і па ўсім СНД. Але ёсць станоўчыя зрухі: дзякуючы мінулагодняму шоу на самы масавы пацалунак, што адбыўся ў Мінску ў спорткомплексе “Уручча”, пра гэта любімае ў Еўропе свята даведалася шмат нашых землякоў. Сёлета нічога такога глабальнага, здаецца, не плануецца, але калі вы ўсё ж вырашыце адзначыць яго, то гульня прызначэння Валянціна і Валянціны будзе дарэчы.

У два капелюшы складваюцца паасобку запіскі з імёнамі ўсіх прысутных жанчын і мужчын, уключаючы дзяцей і немаўлят. Потым адначасова выцягваюць па паперцы з розных капелюшоў, і асобы, трапіўшыя ў пару, абвяшчаюцца да наступнага свята Валянцінай і Валянцінам — закаханымі. Даволі часта ўзнікаюць розныя недарэчнасці і кур'ёзы, але выклікаюць яны толькі смех і станоўчыя эмоцыі. Тым не менш Валянцін усё роўна павінен быць галантным са сваёй Валянцінай і што-небудзь ёй падарыць.

Канешне, можна многа чуць і ведаць нават пра самае прыгожае свята. Але лепш паспрабаваць яго адзначыць. І не важна, якія традыцыі вы возьмеце за аснову ці прыдумаеце свой спосаб святкавання. Галоўнае — гэта тыя станоўчыя эмоцыі, якія вы атрымаеце ад гэтага, бо дзень святога Валянціна не менш спрыяльны для такіх эмоцый, чым іншыя святочныя дні.

*Вадзім ЗУБРЫЦКІ,*
*студэнт геафака.*
*Спецыяльна для “Беларускага універсітэта”*



## УСЯГО 30 МЕСЯЦАЎ

Прафесар Сіндзі Нэйзен (ЗША) правяла апытанне, у якім удзельнічалі 5 тысяч мужчын і жанчын з 37 краін свету. Яна прыйшла да высновы: палкае каханне (страсць) доўжыцца не больш за 30 месяцаў. Пасля эйфарычнай стадыі закаханыя або пачынаюць сумеснае жыццё, або развітваюцца.

Акрамя таго, прафесар Нэйзен вызначыла, што мужчыны больш улюблівыя. Затое жанчыны больш рашуча пакідаюць сваіх партнёраў.

## РАЎНАЦЭННЫ АБМЕН

Сёння людзі схільны цалаваць адзін аднаго часцей, чым рабілі гэта ў далёкім мінулым. Да такой высновы прыйшлі спецыялісты таварыства рацыянальнай псіхалогіі ў Мюнхене, апытаўшы больш за 2000 мужчын і жанчын ва ўзросце ад 16 да 60 гадоў. Чалавек цалуецца за жыццё 86000 разоў — у сярэднім, канешне. Гэтыя даныя навукова абгрунтаваны. З пункту гледжання фізіялогіі пацалунак уяўляе сабой даволі складаную з'яву: пульс чалавека пачашчаецца амаль удвая, павышаецца крывяны ціск, актывізуецца дзейнасць шчытападобнай залозы. Адбываецца і ўзаемны абмен вялікай колькасцю бактэрый. З аднаго боку, ты набываеш пэўную колькасць бактэрый у дадатак да сваіх, а з другога — ад столькіх жа і пазбаўляешся. Так што цалуйцеся!

## ПЁТР І ЗАБАРАНІЎ ДУРНЯМ ЖАНІЦЦА

У 1724 годзе Пётр І выдаў указ, які забараняў шлюбы па прымусе.

Відаць, гэта быў вынік мінулых памылак Пятра І, бо ён двойчы спрабаваў сілком ажаніць свайго сына Аляксея. Прыкладна ў гэты ж час гасудар падпісаў шэраг законаў, прысвечаных сямейным адносінам. Гэтыя законы змякчалі дамастроеўскія догмы, якія панавалі на Русі доўгія гады. Цяпер маладыя людзі мелі роўнае права выбіраць сабе пасію для законнага сумеснага пражывання. Нельга сказаць, што загад цара выконваўся паўсюль, але ўсё ж...

Пётр І таксама адмяніў абавязковыя заручыны і пазбавіў юрыдычнай сілы шлюбныя няўстойкі, так званыя "зарады". І нават дазволіў змешаныя шлюбы паміж рознымі нацыянальнасцямі. Праўда, усе гэтыя ўступкі не перашкодзілі Пятру выкарыстоўваць шлюбнае заканадаўства на карысць сабе, г. зн. для палітычных мэт. У прыватнасці, ён забараніў шлюбы "дурняў" і непісьменных дваран, каб адукаваць тых, хто воляй лёсу быў да яго набліжаны. Не сакрэт, што многія баяры ўвогуле не ўмелі пісаць, выкарыстоўваючы для гэтых "няхітрых" мэт царкоўных служкаў або простых пісараў.

Увогуле, Пётр І заклаў аснову для сучаснага шлюбнага заканадаўства. А для таго часу гэта быў амаль рэвалюцыйны крок.



# ЦІ ВЕДАЕЦЕ ВЫ ПСІХАЛОГІЮ ЖАНЧЫНЫ І МУЖЧЫНЫ?

Калі вы згодны з ніжэйпададзенымі сцвярджэннямі, то пастаўце сабе плюс, а калі не згодны — мінус.

1. Жанчына горшы кіраўнік.
2. Мужчына менш схільны да захворвання на бранхіт.
3. Жанчына больш імкнецца разнастаіць сваё жыццё.
4. Мозг мужчыны па аб'ёме і вазе большы за мозг жанчыны.
5. Жанчыны больш схільны прымаць усё на сябе.
6. У мужчын значна лягчэй, чым у жанчын, пахіснуць упэўненасць у сабе.
7. Мужчына надае забабонам менш увагі.
8. У жанчын часцей бывае язва страўніка.
9. Мужчына сваім справам надае большую грамадскую значнасць.
10. Мужчына больш прамы і адкрыты.
11. Мужчынам для ўнутрага спакою больш, чым жанчынам, патрэбна страхаванне (жыцця, маёмасці).
12. Мужчын лягчэй загіпнатызаваць.
13. Па статыстыцы жанчыны часцей, чым мужчыны, здзясняюць самагубствы.
14. Сярод мужчын менш тых, хто заікаецца.
15. Сярод геніяў больш мужчын.
16. Мужчыны ў цэлым спяць лепш.
17. Мужчыны па-іншаму разумеюць гумар.
18. Мужчына значна горш пераносіць боль.
19. Мужчыны радзей за жанчын свядома ўвязваюцца ў вострыя канфлікты са сваімі роднымі і блізкімі.
20. У складаных сітуацыях, якія патрабуюць хуткай рэакцыі, мужчыны рэагуюць хутчэй за жанчын.
21. Мужчынам цяжэй прытрымлівацца дыеты.
22. Мужчыны — большыя эгаісты, чым жанчыны.
23. Мужчыны дасягаюць большых жыццёвых поспехаў.
24. Мужчыны больш за ўсё цэняць у жанчыне натуральнасць.
25. Калготкі больш жаноцкія, чым панчохі.
26. Мужчынам больш падабаюцца хударлявыя жанчыны, чым поўныя.
27. У жаночым сілуэце мужчыны ў першую чаргу звяртаюць увагу на верхнюю частку фігуры, а ўжо потым на ногі.
28. Мужчыны больш, чым жанчыны, схільныя да здрады.
29. Для мужчын характэрны чуллівасць і эмацыянальнасць, для жанчын — халоднасць і разважлівасць.
30. Жанчынам уласціва інтуіцыя, мужчынам — рацыянальнасць і аналітычнасць розуму.
31. Мужчыны больш імпульсіўныя, неабачлівыя і легкадумныя, жанчыны — сабраныя і прадбачлівыя.
32. Мужчыны часцей праяўляюць уменне ўнікаць у сутнасць справы, жанчыны — больш павярхоўныя.
33. Жанчыны больш напорыстыя і рашучыя, мужчыны часцей праяўляюць асцярожнасць і разважлівасць.
34. Для жанчын уласцівы непастаянства і пераменлівасць, для мужчын — настойлівасць.
35. Мужчыны больш самаўпэўненыя.
36. У жанчын актыўнасць пераважае над пасіўнасцю, а ў мужчын — наадварот.
37. Мужчыны часцей праяўляюць эгаізм, схільнасць да камфорту, жанчыны — самастойнасць, гатоўнасць да самаахвяравання.
38. Жанчыны больш велікадушныя, мужчыны ж — зайздросныя.
39. Мужчыны часцей праяўляюць цікаўнасць, жанчыны — абыякавасць.
40. Жанчыны больш прывязаныя да дома, мужчыны больш захоплены справамі, работай, стварэннем шырокага кола грамадскіх сувязей.

А цяпер праверце сябе. За кожнае супадзенне з ніжэйпададзенымі адказамі налічыце сабе адзін бал.

1. Так. 2. Не. 3. Не. 4. Так. 5. Так. 6. Так. 7. Не. 8. Не. 9. Так. 10. Так. 11. Не. 12. Не. 13. Не. 14. Не. 15. Так. 16. Так. 17. Так. 18. Не. 19. Так. 20. Так. 21. Не. 22. Так. 23. Так. 24. Так. 25. Не. 26. Не. 27. Так. 28. Так. 29. Не. 30. Так. 31. Не. 32. Так. 33. Не. 34. Так. 35. Так. 36. Не. 37. Так. 38. Не. 39. Не. 40. Так.

Падлічыце суму балаў. Калі ў вас атрымалася ў суме да **12 балаў**, для вас мужчына альбо жанчына з'яўляецца загадкай, вывучайце правільныя адказы.

Сума балаў **ад 12 да 20** — нешта пра мужчын альбо жанчын вы ведаеце, але яшчэ не ўсё. Пастарайцеся вывучыць іх больш рэалістычна (і на рабоце, і дома, і ў эмацыянальным жыцці).

Калі ў суме атрымалася **ад 21 да 32 балаў**, то вы больш-менш разбіраецеся ў гэтым пытанні. Яшчэ крыху, і вы будзеце беспамылкова разгадваць душу мужчыны альбо жанчыны.

Калі ж у вас **ад 33 да 40 балаў**, вы — эксперт па мужчынскіх і жаночых пытаннях. Ацэньваеце мужчын і жанчын беспамылкова. Такое разуменне мужчынскай і жаночай псіхалогіі вызначае шчасце ў сямейным жыцці.

*Матэрыялы паласы падрыхтавала Вольга СЫРЫЧ*


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Газета надрукавана ў Выдавецкім цэнтры Белдзяржуніверсітэта 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6*
*Ум. друк. арк. 1*
*Падпісана да друку ў 12.00*

*10 лютага*
*Зак. 59.*
*Т. 1000 экз.*

*Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 2206827.*

**Рэдактар Т. М. КАЗАК**

*Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР*

*Камп'ютэрная вёрстка Яўгена Балаша, Максіма Шорала*